[16] Известия Минского Совета. 1917. 21 июня.

[17] Революционное движение в русской армии в 1917 г. 27 февраля — 24 октября 1917 года. С. 112, 127.

[18] ЦГВИА СССР. Ф. 2048, оп. 1, д. 1358, л. 198, 205; Революционное движение в русской армии в 1917 г. С. 133—134.

[19] Там же. С. 572.

[20] Якупов Н. М. Революция и мир. С. 81.

[21] ЦГАОР СССР. Ф. 3156, оп. 2, д. 6, ч. 1, л. 114-а.

Л. Р. ЦВЫРОЎ

# ДА ПЫТАННЯ АБ ДЗЕЙНАСЦІ КАМІТЭТАЎ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ Ў САКАВІКУ — КАСТРЫЧНІКУ 1917 г.

Перамога Лютаўскай рэвалюцыі садзейнічала стварэнню выбарных камітэтаў на Заходнім фронце. У першай палове сакавіка гэты працэс праходзіў практычна без кантролю і ўдзелу камандавання. Загад № 1 Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў па войсках Петраградскай ваеннай акругі ад 1 сакавіка 1917 г. прадпісваў у рознага роду ваенных падраздзяленнях «неадкладна выбраць камітэты выбарных прадстаўнікоў ад ніжніх чыноў»[1]. Ініцыятарам стварэння салдацкіх камітэтаў на Заходнім фронце выступіў Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які на пасяджэнні 8 сакавіка прыняў адпаведную пастанову. У ёй указвалася, што салдаты ў сваіх палітычных выступленнях павінны падпарадкоўвацца толькі Савету і сваім камітэтам [2].

З моманту ўзнікнення салдацкія камітэты процістаялі старой армейскай арганізацыі. Занепакоенае такім развіццём падзей камандаванне спрабавала паставіць пад свой кантроль дзейнасць камітэтаў, ператварыўшы іх у салдацка-афіцэрскія. У тэлеграме в. а. Вярхоўнага галоўнакамандуючага М. В. Аляксеева, накіраванай 11 сакавіка ў дзеючую армію, гаварылася аб неабходнасці ўвесці ў склад салдацкіх камітэтаў афіцэраў, «...каб узяць ход падзей у свае рукі»[3]. 16 сакавіка гэта ўстаноўка была замацавана загадам галоўнакамандуючага Заходнім фронтам. У ім адзначалася, што «...чым хутчэй армія і тыл пакрыюцца сеткай такіх аб'яднаных салдацка-афіцэрскіх арганізацый... тым больш трывала ўзмацніцца баявая магутнасць арміі. Асноўнымі палажэннямі дзейнасці гэтых арганізацый павінны быць: 1) прызнанне адзінай улады ў руках Часовага ўрада да склікання Устаноўчага сходу; 2) давядзенне вайны да пераможнага канца; 3) захаванне дысцыпліны і боездольнасці арміі; 4) цесная ўнутраная сувязь паміж афіцэрамі і салдатамі»[4]. Аднак камандаванню фронта стварыць значную афіцэрскую праслойку ў камітэтах не ўдалося. На 1 верасня 1917 г. працэнтны састаў афіцэраў і чыноўнікаў, занятых у камітэтах Заходняга фронта, складаў усяго 10,5 %[5] агульнай колькасці ваеннаслужачых.

Асноўнымі рэгулюючымі актамі стварэння камітэтаў і іх дзейнасці сталі «Часовае палажэнне аб арганізацыі чыноў дзеючай арміі і флота», выданае 30 сакавіка 1917 г. в. а. Вярхоўнага галоўнакамандуючага М. В. Аляксеевым; загад № 231 ад 16 красавіка 1917 г. ваеннага міністра А. І. Гучкова, які ўводзіў у дзеянне палажэнне аб ротных, палкавых і армейскіх камітэтах, і загад № 271 ад 8 мая 1917 г. новага ваеннага міністра А. Х. Керанскага, які зацвердзіў палажэнне аб дывізіённых і карпусных камітэтах. Гэтыя нарматыўныя дакументы абмяжоўвалі ўдзел камітэтаў у палітычнай барацьбе і не дапускалі іх умешвання ў аператыўна-тактычную сферу. Адпаведна загаду № 213 агульнымі задачамі камітэтаў з'яўляліся: 1) згуртаванне ўсёй рускай арміі ў адзіную арганізацыю; 2) назіранне за падтрымкай дысцыпліны і парадку ў часцях; 3) кантроль за гаспадарчай дзейнасцю сваёй часці; 4) прынящце законных мер супраць злоўжыванняў і перавышэння ўлады з боку пасадавых асоб; 5) вырашэнне пытання ўнутранага быту часці; 6) уладжванне непаразуменняў паміж салдатамі і афіцэрамі; 7) садзейнічанне адукацыі і развіццю спорту сярод салдат і матросаў; 8) падрыхтоўка да выбараў ва Устаноўчы сход [6].

К 1 верасня 1917 г. на Заходнім фронце была створана цэлая сістэма камітэтаў розных узроўняў. Іх дзейнасць каардынаваў Выканаўчы камітэт (Выканкамзах), выбраны I з'ездам ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тыла Заходняга фронту, які праходзіў у Мінску з 7 па 16 красавіка. У яго склад пачаткова ўвайшлі 75 чалавек: 45 — адфронту, 20 — ад тылу і 10 —

ад Мінска. Па партыйнаму складу Выканкамзах быў наступным: 32 эсэры, 29 сацыял-дэмакратаў (у тым ліку 6 бальшавікоў), 14 беспартыйных [7]. Камітэты тылавых часцей і гарнізонаў знаходзіліся ў распараджэнні Камітэта тылавых часцей і ваенна-акружнога камітэта. Па партыйнаму складу гэтыя органы былі эсэра-меншавіцкімі і прадпісвалі камітэтам «...няўхільна выконваць урадавыя распараджэнні і загады». Агульны кошт утрымання сістэмы камітэтаў на фронце штомесячна складваў не менш 250 тыс. руб.[8]

Аднак, нягледзячы на прынятыя меры, камандаванню фронта не ўдалося цалкам падпарадкаваць сабе дзейнасць камітэтаў. Аб гэтым сведчыць тэлеграма камандуючага фронтам А. І. Дзянікіна ў стаўку ад 11 чэрвеня 1917 г.: «У цяперашні час у войсках фронта існуюць камітэты, сфарміраваныя явачным парадкам... У тых часцях, дзе існуюць камітэты, створаныя на іншых асновах, прывядзенне ў дзеянне загадаў № 213, 271 прыпынена. Гэтыя камітэты не жадаюць прызнаваць абавязкаў, выкладзеных у гэтых загадах, а выпрацоўваюць для сябе свой асобы круг абавязкаў і праў, прычым асабліва моцна пасягаюць на аператыўны кантроль і адвод начальнікаў...»[9]

Развіццю такой актыўнасці камітэтаў садзейнічала палажэнне «Аб салдацкіх арганізацыях і Саветах салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў», прынятае ў красавіку з'ездам армій і тылу Заходняга фронту. Яно давала камітэтам права атэставаць асоб каманднага саставу і прадугледжвала змяшчэнне іх з пасады ў выпадку адмоўнай атэстацыі [10]. Сваю ролю адыгралі таксама рашэнні Мінскай нарады прадстаўнікоў армейскіх і франтавога камітэтаў па пытаннях аб дзейнасці ў арміі (18—22 чэрвеня 1917 г.). У наказе ўсім камітэтам арміі і тылу фронту прадпісвалася садзейнічаць палітычнаму выхаванню салдат шляхам засваення праграм палітычных партый і дзейнасці партыйных арганізацый у выпадку іх узнікнення [11].

Камандаванне фронту бачыла ў дзейнасці камітэтаў, заснаваных на такіх прынцыпах, адмоўныя моманты. У аглядзе палітычнага ўпраўлення фронту, падрыхтаванага ў пачатку верасня 1917 г., указвалася, што вынікі дзейнасці камітэтаў наўрад ці пакрываюць затрачаныя на іх сілы і сродкі і наўрад ці сістэма камітэтаў здольна апраўдаць ускладзеныя на яе надзеі ў сэнсе падняцця боездольнасці арміі і яе рэарганізацыі на новых пачатках. У віну камітэтам ставіліся тоеснасць прымаемых рашэнняў, неразуменне рэальных магчымасцей і выдвіжэнне празмерных патрабаванняў да камандавання і ўрада, празмернае захапленне палітыкай. У станоўчым плане ацэньваліся толькі дзеянні ротных і палкавых камітэтаў па пераадольванню буйных эксцэсаў у сваіх часцях і навядзенню парадку. Адмоўную адзнаку атрымала і дзейнасць франтавога камітэта як «рэзка схіляючаяся да бальшавізму»[12]. Гэта ў значнай меры было звязана са змяненнем партыйнага складу Выканкамзаха (к восені 1917 г. у камітэце была створана бальшавіцкая фракцыя з 13 чалавек на чале з А. Ф. Мясніковым).

Іншымі былі адносіны камандавання фронту да армейскіх камітэтаў, у якіх большасць складалі меншавікі і эсэры. Так, у рапарце А. І. Дзянікіна Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму ад 11 чэрвеня 1917 г. армейскія камітэты 3-й і 10-й армій, што байкатавалі рашэнні франтавога камітэта, ацэньваліся станоўча [13].

Дзейнасць камітэтаў у разглядаемы перыяд падзяляецца на два этапы. Першы прыходзіўся на сакавік — май 1917 г. і, па ацэнцы ваеннага камісара пры галоўнакамандуючым арміямі Заходняга фронту В. Ямандта, быў прадуктыўным, калі «ротныя, палкавыя і іншыя камітэты карысталіся поўным даверам і садзейнічаннем з боку каманднага саставу». У сваю чаргу камітэты імкнуліся падтрымліваць у часцях дысцыпліну і парадак, выносілі пастановы аб поўным падпарадкаванні афіцэрам.

Другі этап (з чэрвеня па кастрычнік 1917 г.) характарызаваўся рэзкай стратай аўтарытэту і ўплыву камітэтаў сярод салдацкіх мас, што прывяло да развалу сістэмы камітэтаў старога складу. Аналіз дакументаў дазваляе вызначыць некалькі прычын гэтага працэсу. Адной з асноўных трэба лічыць дэструктыўную палітыку камандавання ў адносінах да камітэтаў. Згадзіўшыся на ўвядзенне камітэтаў у арміі як на вымушаны кампраміс, камандаванне ўвесь час знаходзілася ў апазіцыі да іх. Як сведчыў В. Ямандт, яно імкнулася адціснуць камітэты ад практычнай працы і пераўтварыць іх у «канцылярскую арганізацыю». Увядзенне ваенна-рэвалюцыйных судоў (пастанова Часовага урада ад 12 ліпеня) было ўспрынята камандным саставам як першы крок да вяртання старых парадкаў у арміі. Пачаліся павальныя арышты, якія выклікалі вялікае азлабленне ў радах арміі і значна аслабілі значэнне камітэтаў у часцях [14]. Камандаванне імкнулася рэпрэсіямі

стрымаць рост рэвалюцыйнай свядомасці салдат, настрой якіх стыхійна адлюстроўвалі камітэты.

Падзенне аўтарытэту выбарных арганізацый мела сувязь і з тым, што практычна ўсе камітэты вышэйшых ступеняў, за выключэннем франтавога, армейскага 2-й арміі, камітэта 50-га корпуса, цалкам знаходзіліся пад уплывам меншавікоў і эсэраў. З'яўляючыся выразнікамі палітыкі Часовага ўрада, які да кастрычніка 1917 г. фактычна страціў давер салдацкіх мас, гэтыя партыі таксама страчвалі падтрымку на фронце. Негатыўныя адносіны да іх салдаты пераносілі на камітэты. Адначасова ўзмацнялася цікавасць салдат да праграмы партыі бальшавікоў як альтэрнатыўнай для выхаду з эканамічнага і палітычнага крызісу і спынення вайны. У тэлеграме камісара Заходняга фронту В. А. Жданава камісару пры стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага ад 14 кастрычніка падкрэслівалася: «Ідэі бальшавізму пачынаюць звіваць сабе гнёзды і хуткімі тэмпамі перакідваюцца ў часці, імі не кранутыя...»[15]

У аглядзе дзейнасці камітэтаў з 15 па 30 кастрычніка са шкадаваннем адзначалася: «Аўтарытэт і ўплыў камітэтаў падаюць. У апошні час гэтая з'ява стала агульнай для ўсіх армій Заходняга фронту. Прычыны: 1) камітэты ў вялікай большасці аказвалі садзеянне каманднаму саставу і, ідучы насуперак імкненням мас, настроілі іх супраць сябе; 2) узмацнілася агітацыя бальшавікоў. Вынік у наяўнасці: у многіх часцях камітэты, ці самі складваюць паўнамоцтвы, ці перавыбіраюцца і замяняюцца камітэтамі, якія цалкам складваюцца з бальшавікоў. Многія камітэты выносяць палітычныя рэзалюцыі, афарбоўка якіх ярка бальшавіцкая, што ўказвае на тое, што агітацыя бальшавікоў, аб узмацненні якой аднагалосна даносілі ўсе камандзіры карпусоў, не была дарэмнай і падрыхтоўка бальшавіцкага паўстання ў вайсках вялася досыць інтэнсіўна»[16].

Ва ўмовах страты апоры ў салдацкіх масах пераважная колькасць камітэтаў вышэйшага звяна захавала адданасць Часоваму ўраду і, блакіруючыся з камандным саставам, спрабавала выступіць як арганізуючая сіла ў барацьбе супраць узброенага паўстання бальшавікоў. Як сведчаць дакументы, гэтай палітычнай лініі трымаліся франтавы, акруўжны, выканаўчы камітэты Савета сялянскіх дэпутатаў Заходняга фронту, а таксама многія армейскія і карпусныя камітэты. Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца пастанова армейскага камітэта 2-й арміі ад 26 кастрычніка 1917 г., у якой адзначалася, што камітэт рэзка асуджае пагібельнае для радзімы выступленне бальшавікоў і «лічыць тэлеграмы Петраградскага ВРК сеючымі смуту і здольнымі толькі вызваць грамадзянскую вайну ў арміі». Камітэт прызываў выступіць супраць гібельных авантур злева[17]. Пры абмеркаванні гэтага дакумента бальшавіцкая фракцыя пакінула пасяджэнне камітэта. У сваю чаргу бальшавікі заклікалі салдат актыўна падтрымаць рэвалюцыйны пераварот у Петраградзе. Гэты заклік знайшоў водгук і падтрымку нізавых камітэтаў. Напрыклад, рэзалюцыя пленарнага пасяджэння 6-й пяхотнай дывізіі абвяшчала: «Мы шлём сваё прывітанне Петраградскаму пралетарыяту і рэвалюцыйнаму гарнізону, палажыўшым канец палітыцы магільшчыкаў рэвалюцыі, якую вёў кааліцыйны ўрад. Мы вітаем уладу пралетарыяту, салдат і сялян у твары іх выбарных арганізацый-Саветаў салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Толькі ўлада, якая абапіраецца на арганізаваную волю ўсёй дэмакратыі, можа вывесці краіну з тупіка...»[18]

Такім чынам, сістэма выбарных камітэтаў Заходняга фронту, як і ўсей дзеючай арміі, адыграла пэўную станоўчую ролю. Для мільёнаў салдат камітэты былі школай палітычнага станаўлення, далучэння да актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы. Як адзначаў савецкі гісторык В. І. Мілер, сістэма камітэтаў выступіла гарантам палітычнай стабільнасці ў арміі ў крытычныя моманты рэвалюцыі. Гэты вывад пацвердзіла і бальшавіцкая газета «Рабочий путь», якая пісала, што калі б не было армейскіх камітэтаў, ці калі б яны былі пазбаўлены большасці сваіх правоў, армія апынулася б у руках контррэвалюцыйных генералаў[19]. Так было, напрыклад, у час выступлення генерала Карнілава, калі фактычна ўсе камітэты Заходняга фронту, блакіравалі спробы рэакцыйнага камандавання арганізаваць яго падтрымку.

Разам з тым раз'яднанасць камітэтаў фронту, адарванасць вышэйшага звяна ад салдат выклікалі адмоўныя тэндэнцыі ў іх дзейнасці. Яны былі пераадолены пазней у ходзе развіцця рэвалюцыі. Рэвалюцыйная ініцыятыва салдат падштурхоўвала камітэты на радыкальныя пазіцыі. У выніку большасць камітэтаў фронту падтрымала ўстанаўленне Савецкай улады.

[1] Революционное движение в русской армии в 1917 году (февраль — октябрь). М., 1968. С. 20—21.
[2] Гл.: Миллер В. И. Солдатские комитеты русской армии в 1917 году. М., 1974. С. 62.
[3] Войсковые комитеты действующей армии (март 1917 г.— март 1918 г.): Сборник документов. М., 1982. С. 31.
[4] Разложение армии в 1917 году. М.; Л., 1925. С. 59.
[5] Гл.: ЦДВГА. Ф. 2003, воп. 4, спр. 25, арк. 38.
[6] Гл.: Там жа. Ф. 2048, воп. 1, спр. 119, арк. 1.
[7] Гл.: Победа Советской власти в Белоруссии. Мн., 1967. С. 123.
[8] ЦПА КПБ. Ф. 35, воп. 1, спр. 22а, арк. 3; ЦДВГА. Ф. 2003, воп. 4, спр. 25, арк. 37.
[9] Там жа. Воп. 1, спр. 1790, арк. 1.
[10] Гл.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 209.
[11] ЦДВГА. Ф. 2003, воп. 1, спр. 1798, арк. 265.
[12] Там жа. Воп. 4, спр. 25, арк. 39—42.
[13] Гл.: Разложение армии в 1917 году. С. 113.
[14] Там жа.
[15] ЦДВГА. Ф. 2003, воп. 4, спр. 31, арк. 40.
[16] Там жа. Спр. 25, арк. 76.
[17] Там жа. Ф. 2048, воп. 1, спр. 1123, арк. 249.
[18] Там жа. Арк. 247.
[19] Гл.: Миллер В. И. Солдатские комитеты русской армии в 1917 году. С. 11.

В. В. КАЛЮТА

## ПРОБЛЕМЫ СТАНОВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО ПОДПОЛЬЯ В НАЧАЛЬНЫЙ ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Четыре года длилась Великая Отечественная война, унесшая миллионы человеческих жизней. Самым тяжелым и трагическим для нашей страны был 1941 г.— год первых кровопролитных боев, первых побед и тяжелых поражений, год организации и становления всенародной борьбы в тылу немецко-фашистских захватчиков. Нелегким этот год был и для Коммунистической партии Белоруссии, которая, возглавив борьбу, столкнулась с рядом серьезных трудностей при организации подполья и партизанского движения на оккупированной врагом территории.

22 июня 1941 г. состоялось заседание бюро ЦК КП(б)Б, рассмотревшее вопрос «О задачах партийных организаций в связи с вероломным нападением фашистской Германии на СССР». Центральный Комитет указал на необходимость «немедленной перестройки работы парторганизаций на военные рельсы...»[1] Однако быстротечность военных событий вносила свои коррективы в организацию отпора фашистским захватчикам. Уже на четвертые сутки почти все западные области республики — Белостокская, Брестская, Барановичская, Вилейская — были захвачены врагом. Связь с областными комитетами партии была прервана. Многие партийные руководители этих областей пали в боях с гитлеровцами.

Заседания бюро ЦК КП(б)Б в первые дни войны проходили ежедневно и были направлены на решение первоочередных военно-хозяйственных задач. 25 июня в связи с угрозой захвата Минска ЦК КП(б)Б переместился в Могилев.

29 июня была принята «Директива Совнаркома Союза ССР и ЦК ВКП(б) партийным и советским организациям прифронтовых областей о мобилизации всех сил на борьбу с германским фашизмом».

Как известно, в предвоенные годы в сознание советских людей активно внедрялось убеждение, что в случае нападения на СССР враг получит сокрушительный отпор, а затем война будет продолжаться на территории противника. На это был ориентирован и устав Красной Армии. Из решений VII конгресса Коминтерна (1935 г.) вытекало, что рабочие зарубежных стран, призванные в армию, не будут воевать против первой в мире страны социализма [2]. Эти ошибочные взгляды вводили в заблуждение многих руководителей и явились одной из причин несвоевременной подготовки и перехода на подпольные методы работы.

30 июня ЦК Компартии Белоруссии направил на места директиву № 1 о подготовке к переходу на подпольную работу парторганизаций районов, находившихся под угрозой фашистской оккупации. Директива содержала